*змаганьнем за сваю нацыянальнасьць і волю,* гэтак ідэя нацыянальнага і палітычнага вызваленьня атрымала гранітны фундамэнт у сьвядомасьці нашае вясковае беднаты, што *без такога вызваленьня зямлі яна ня ўбачыць.*

А такое сьвядомасьці не зламае ніякая сіла!

## Селянін і работнік

Некалькі вякоў назад адзін хітры італьянец на ймя Макіявелі даў валадаром, улада якіх пачынала трашчэць, добрую раду, як аднаму чалавеку ўтрымаць уладу над мільёнамі. Ён казаў:

— „Divide et impera“, што знача: дзялі і пануй!

І запраўды: шляхам дзяленьня сваіх ворагаў, шляхам цкаваньня іх адных на адных адзінкі і малыя групы людзей і па сёньняшні дзень умеюць панаваць над вялізарнымі народнымі масамі, калі апошнія йдуць ня разам, а падзелены на варожыя сабе ўзаемна групы ды змагаюцца паміж сабою.

Тое, што сталася ў старой царскай Расеі ў выніку сусьветнае вайны, найлепш паказуе, што ў той момант, калі мільёны працоўных — работнікаў і сялян — апынуліся разам, апранутыя ў аднолькавыя шэрыя салдацкія шынялі, — у той момант улада царызму не магла супрацівіцца народнай волі і ў вадзін момант развалілася, як быццам яе ніколі й не было...

Цяпер, калі на ўсенькім сьвеце барацьба працы з капіталам разгарэлася так, як дагэтуль не бывала, мы ўсюды бачым імкненьне да аб’яднаньня дзьвюх галоўных сілаў народаў: работнікаў і сялян. Там, дзе сьвядомасьць працоўных ужо настолькі разьвіта, што яны разумеюць усё значэньне такога аб’яднаньня, там вынік змаганьня за ўладу не выклікае ніякіх сумляваньняў. Наадварот, дзе сялянства і работнікі йдуць рознымі дарогамі, дзе іх шляхі разыходзяцца, там на перамогу працоўных надзеі вельмі мала...

У Польшчы адна з урадавых цяпер партыяў — ППС, якая некалі мела вялікі ўплыў у масах, ды цяпер яго зусім згубіла, — у часы сваей апазыцыйнасьці падняла кліч: „Niech żyje rząd robotniczo–włościanski!“ (Няхай жыве работніцка–сялянскі ўрад!). Цяпер ад гэтага клічу астаўся толькі адзін сьлед — на паперы: у загалоўку пэпээсаўскае газэты „Robotnik“. Але адрачэньне ад гэтага лёзунгу цяперашняе ППС зусім не зьмяншае правільнасьці яго.

Кліч гэты падтрымлівалі дагэтуль і ўсе беларускія апазыцыйныя партыі і групы: выпадкі на Ўсходзе зь лішняй яркасьцяй паказалі, якую магутную сілу прадстаўляе братняе аб’яднаньне работнікаў і сялян. Але ў апошнія часы на страніцах дзьвюх беларускіх часопісаў — „Bieł. Krynicy“ і „Сялянскае Нівы“ — мы бачым цэлы рад выступленьняў *проці такое еднасьці.* Паміж іншым, гэтыя часопісі згодным хорам расказваюць казкі, быццам мястовы работнік ня толькі не зацікаўлены тым, каб сяляне дасталі зямлю, а, наадварот, *проці* гэтага, хаця ж усюды і заўсёды іменна работнікі першыя працавалі і працуюць над усьведамленьнем і арганізацыяй сялянскіх сіл — дзеля здаваленьня адвечнага імкненьня сялянства да зямлі. Сколькі такіх работнікаў — змагароў за зямлю для сялянства — згнаілі расейскія царскія астрогі, аб гэтым ня нам гаварыць рэдактаром „сялянскіх“ газэт, як яны сябе называюць. Але нельга прайсьці моўчкі міма другога „аргумэнту“ гэных газэт: міма таго, што яны, відаць, не разьбіраючыся ў сутнасьці ідэі камунізму, бачаць гэны самы камунізм акурат у праводжанай не аднымі намі ідэі аб’яднаньня працоўных места і вёскі, ды гэтым „страшаком“ стараюцца запалохаць беларускага селяніна і настроіць яго проці ягонага „ворага“.

Дзякуй Богу, аднак жа, беларускага селяніна пустымі славамі ўжо не запужаеш, і імкненьне „далучыць“ нас да камуністаў небясьпечна толькі затым, што гэтую партыю польская ўлада вельмі востра перасьледуе: 4—6 гадоў катаргі — вось звычайны прысуд тым, каму давядуць прыналежнасьць да камунізму.

Ну ды Бог зь ім, бо ж і ня гэта самае галоўнае ў палітыцы нашых так званых „сялянскіх“ кірункаў: найвялікшы іх грэх — у тым, што яны памагаюць „нашым і вашым“... ворагам умацоўваць іх уладу, абапертую іменна на гэным старым прынцыпе „дзялі і пануй“. І пакуль працоўныя мест пад Польшчай не згаворацца і не аб’яднаюцца зь сялянствам, датуль аб якой–колечы зьмене ў нашым жыцьці ня можа быць гутаркі.

Сойм, дзе іменна галасамі польскага заможнага сялянства прайшоў закон аб „асадніцтве“ ў Зах. Беларусі і аб аддачы нашых адвечных абшараў — чужым, толькі пацьвярджае гэта.

Мы верым, што, аднак, ніякім сілам ня ўдасца разьбіць такога натуральнага і патрэбнага для абедзьвюх груп працоўных саюзу селяніна і работніка. Лепшыя беларускія дзеячы даўно ўжо клікалі да гэтага саюзу і прарочылі яму перамогу. І не дарма ж у першым нумары першае беларускае газэты „Нашае Долі“ — дваццаць гадоў назад — наша вялікая пясьнярка Цётка ў прарочым натхненьні рысавала абраз, як тры сыны старога селяніна Мацея — дворны парабак, пецярбурскі работнік і салдат — прысягнулі даць народу зямлю: „Мы дамо, мы сіла — мы права!“[1]

Прароцтва гэнае — зьдзейсьніцца!

## Вялікі вадзяны шлях

### (Злучэньне каналам Дзьвіны з Дняпром)

Ужо тысяча гадоў назад паміж Балтыцкім і Чорным морам быў установлены вадзяны шлях. Купцы, заваявальнікі ці проста падарожныя, якім трэба было з надбалтыцкіх краін папасьці ў Усходнюю ці Ўсходне–Паўдзённую Эўропу, прабіраліся туды найбольш даступным тады і лёгкім спосабам — па вадзе, але не акольнай марской дарогай навакол усяе Заходняе Эўропы, страшэнна даўгой і невыгоднай, а найкарацейшым шляхам — па рэках, плывучы ўверх цячэньня рэк Балтыцкага басэйну, пасьля перацягваючы чаўны сухапуцьцем праз так званы Карпата–Валдайскі вададзел і пападаючы ў вялізарную раку Днепр, па якой спускаліся на палудзень ажно да Чорнага мора. Шлях гэты праразаў з поўначы на палудзень усю цяперашнюю Беларусь.

З ходам часу, калі на вялізарных прасторах Усходняе Эўропы патварыліся з’арганізаваныя гаспадарствы, калі папракладалі праз пушчы і балоты выгодныя калёсныя дарогі, пабудавалі масты на непераходных раней рэках, гэны вадзяны шлях, вядомы ў гісторыі пад назовам „вялікае вадзяное дарогі з варагаў у грэкі“, утраціў сваё колішняе значэньне. Але ў мінулым сталецьці, калі пачало выяўляцца значнае разьвіцьцё таргоўлі таварамі, якія займаюць шмат месца, прадстаўляюць вялікі цяжар ды невялікую маюць цану, справа выкарыстаньня дзеля іх правозу танных вадзяных шляхоў ізноў станула на парадку дня. Да такіх цяжкіх на вагу ды недарагіх па цане тавараў належыць перадусім лес, якога ў нас на Беларусі заўсёды было многа ды які йшоў, з аднаго боку, у бедную лесам Украіну, з другога — у Заходнюю Эўропу. Вось жа ў мінулым сталецьці дзеля ўтварэньня магчымасьці сплаву нашага дрэва як на палудзень, так і на паўночны захад — да Балтыцкага мора, прыток Дзьвіны, Ула, быў злучаны каналам з прытокам Дняпра — Бярэзінай, і гэтак вадзяным шляхам мог адбывацца рух тавараў паміж Балтыцкім і Чорным морам.

Аднак канал гэны быў пабудаваны дужа прымітыўна і мог служыць, бадай, выключна дзеля сплаву лесу. А тым часам эканамічнае жыцьцё ўсьцяж разьвівалася і вымагала ўзмацаваньня targовых зносінаў у краю, а таксама зносінаў паміж узьбярэжнымі надморскімі краінамі зь іх портамі на Балтыцкім і Чорным моры, з аднаго боку, ды вялізарнымі абшарамі Беларусі і Ўкраіны — з другога.

Яшчэ да сусьветнае вайны ў Пецярбурзе пры міністэрстве шляхоў [зносін?] была створана адумысная камісія дзеля распрацаваньня праекту пабудовы вялікага каналу між